ПАДЗЕЯ

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ Янкі Купалы

# НА ПАКЛОН ДА КУПАЛЫ

**8 ліпеня бягучага года ў Купалаўскім мемарыяльным запаведніку «Вязынка» (Мінская вобласць, Маладзечанскі раён) адбылося свята паэзіі, песні і народных рамёстваў пад назвай «З адною думкаю аб шчасці Беларусі…».**

Арганізаванае Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўным літаратурным музеем Янкі Купалы і Маладзечанскім райвыканкамам свята мастацтва і беларускай народнай культуры было прысвечана Дню нараджэння класіка беларускай літаратуры. На паклон да несмяротнага вобраза Песняра з'ехаліся дзеячы культуры, літаратары з розных куткоў Беларусі. Сваім мастацтвам і творчай працай госці ўшанавалі памяць паэта.

У межах свята «З адною думкаю аб шчасці Беларусі…» Саюз пісьменнікаў Беларусі прадставіў праграму «Застаюцца песня і радзіма». У ёй прыняла ўдзел дэлегацыя Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ у складзе: Таццяна Яцук (Навагрудскі раён), Ала Клемянок (Смаргонь) і Уладзімір Руль (Воранаўскі раён). Беларускія паэты выступілі з дэкламацыяй уласных лірычных твораў, тэматыка якіх была непарыўна звязана з вобразам Янкі Купалы, а таксама вызначалася тэмай міру і стварэння.

**ПРЭС-СЛУЖБА СПБ-ГРОДНА**

**На фота:** творчая праграма Саюза пісьменнікаў Беларусі «Застаюцца песня і радзіма» ў межах свята паэзіі, песні і народных рамёстваў пад назвай «З адною думкаю аб шчасці Беларусі…» з удзелам прадстаўнікоў Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ. Купалаўскі мемарыяльны запаведнік «Вязынка» (Мінская вобласць), 8 ліпеня 2023 года



**Паэты з  розных куткоў Гродзенскай вобласці на радзіме Янкі Купалы:**
**Уладзімір Руль, Таццяна Яцук, Ала Клемянок**



**Вязынка, ліпень 2023. Паэты Гродзеншчыны і Міншчыны на свяце, прысвечаным Дню нараджэння Песняра**



**Творчая праграма Саюза пісьменнікаў Беларусі «Застаюцца песня і радзіма». Вядучая першы намеснік старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэтэса Алена Стэльмах і паэт, журналіст Навум Гальпяровіч**



**Таццяна Яцук і Віктар Шніп**



**Фота [з сайта СПБ-Мінск]**